## § 35. Правапіс канчаткаў назоўнікаў у множным ліку (у родным і творным склонах)

**213.** Прачытайце верш. У якіх радках перададзена яго асноўная думка?

I радасць — ніякая радасць, а горыч,
I песня — ніякая песня, а скарга,
I страва — ніякая страва, а камень,
I сонца — ніякае сонца, а крыга, —
Калі ты на свеце ўсім гэтым
Не маеш з кім падзяліцца.

*Максім Танк.*

Якія з назоўнікаў, што ўжываюцца ў вершы, не маюць формы множнага ліку?

Выпішыце назоўнікі, якія маюць форму множнага ліку, утварыце формы роднага склону. Абазначце канчаткі.

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае значэнне ‘выражэнне незадавальнення, нараканне з прычыны якіх-небудзь непрыемнасцей’.

Назоўнікі ўсіх трох скланенняў у множным ліку ва ўсіх склонах, за выключэннем роднага, маюць аднолькавыя канчаткі.

Абсалютная большасць назоўнікаў у родным склоне маюць канчаткі **-оў (-ёў)** або **-аў (-яў)**: *апельсін***аў**, *рубл***ёў**, *сэрц***аў**, *рэч***аў**, *вед***аў**, *гульн***яў**.

Большасць назоўнікаў з асновай на адзін зычны маюць нулявы канчатак: *мова — моў*□, *думка — думак*□, *падзея — падзей*□.

Некаторыя назоўнікі з асновай на адзін зычны і з асновай на збег зычных могуць мець варыянтныя канчаткі: *сёстры — сясцёр*□ і *сёстр***аў**, *норма — норм*□ і *норм***аў**.

У назоўніках на **-ня** ў родным склоне множнага ліку на канцы пішацца мяккі знак: *яблыня — яблын***ь**, *кнігарня — кнігаран***ь**.



Правообладатель Национальный институт образования

**214.** Спішыце, раскрываючы дужкі.

1. Як мы да *(людзі)*, так і людзі да нас. 2. Салаўінымі *(песні)* не будзеш сыты. 3. Чалавек без *(сябры)*, што печ без *(дровы)*. 4. Для добрых *(госці)* вароты самі адчыняюцца. 5. Хто ў *(людзі)* не верыць, той сабе рады не дасць. 6. Хто душы не мае, у таго *(госці)* не бывае.

● Чаму слова *без* у трэцім сказе ў спалучэннях з рознымі назоўнікамі вымаўляецца па-рознаму?

У творным склоне множнага ліку назоўнікі ўсіх трох скланенняў у залежнасці ад апошняга зычнага асновы маюць канчаткі ***-амі, -ямі***: *бяроз**амі***, *верш**амі***, геро***ямі***, *пал**ямі***.

Назоўнікі *вочы, вушы, грошы, дзверы* могуць ужывацца з варыянтнымі канчаткамі ***-амі, -ыма***: *вач**амі*** — *вач**ыма***, *граш**амі*** — *граш**ыма***, *дзвяр**амі*** — *дзвяр**ыма***.

**215.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму. Да якога стылю і тыпу маўлення адносіцца тэкст?

Віця, Сцёпа і Лёня лічаць сябе *(сябры)*. Ідуць сабе па сцяжын*(к/ц)*.. каля ракі. Вада халодная, цёмнымі *(хвалі)* пераліваецца, дрыжыць ад пранізлівага восеньскага ветр.. . Хлопцы перамаўляюцца ды *(мары)* пра будучыню дзеляцца. Віця *(караблі)* цікавіцца, марак.. хоча стаць. Сцёпа артыст.. хоча быць. Толькі хацеў Лёня пра сваю мару паведаміць, як хлопцы пачулі: хтосьці ў вад*(д/дз)*.. плюхаецца, жаласна скуголіць. Лёня хуценька распрануўся і кінуўся ў ваду. Праз некалькі хвілін хлопчык ужо на бера*(г/з)*.. стаіць, да *(грудзі)* сабачк.. прыціскае... *(Паводле В. Дзякевіча)*.

Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце выбар канчаткаў.

Як вы думаеце, што адбылося далей? Прыдумайце працяг апавядання. Падбярыце да яго загаловак. Вусна перакажыце тэкст, прыдумаўшы яго працяг.



Правообладатель Национальный институт образования

**216.** Спішыце, падкрэсліце назоўнікі. Вызначце ўсе вядомыя вам марфалагічныя прыметы назоўнікаў: нязменныя (агульны ці ўласны; адушаўлёны ці неадушаўлёны; канкрэтны ці абстрактны; зборны, рэчыўны; род, скланенне) і зменныя (склон, лік).

Хай свята дружбы будзе лепшым святам,
Хай векам дружбы наш завецца век,
Хай другу друг заўсёды будзе братам,
І другам — чалавеку чалавек.
Заўжды хто-небудзь некага чакае,
Заўжды хто-небудзь некага шукае —
Патрэбен чалавеку чалавек...

*С. Грахоўскі.*

## § 36. Скланенне назоўнікаў, якія абазначаюць імёны, прозвішчы і назвы населеных пунктаў на *-оў, -ёў, -еў, -аў, -ын, -ін*

**217.** Працытайце табліцу. Пісьмова праскланяйце ўласныя назоўнікі. Параўнайце канчаткі прозвішчаў і назваў населеных пунктаў. Зрабіце вывад аб правапісе канчаткаў гэтых назоўнікаў у творным і месным склонах.

| Склон | Канчаткі | Прозвішчы | Склон | Канчаткі | Назвы населеных пунктаў |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | | *Барадулін*□<br>*Куляшоў*□ | Н. | | *Кобрын*□<br>*Тураў*□ |
| Р. | ***-а*** | | Р. | ***-а*** | |
| Д. | ***-у*** | | Д. | ***-у*** | |
| В. | ***-а*** (як Р.) | | В. | □ (як Н.) | |
| Т. | ***-ым*** | | Т. | ***-ам*** | |
| М. | ***-у*** | | М. | ***-е*** | |

Складзіце і запішыце тры сказы, выкарыстоўваючы назвы населеных пунктаў на ***-оў, -ёў, -еў, -аў, -ын, -ін***. Растлумачце іх правапіс.



Правообладатель Национальный институт образования